УДК 37.032

# Фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў у працэсе засваення зместу вучэбнай праграмы «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь»*

**Паноў Сяргей Веніямінавіч,**
вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі Акадэміі адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт; *swpanow@gmail.com*

У артыкуле асвятляюцца тэарэтычныя аспекты функцыянальнай адукаванасці вучняў пачатковай школы, распрацаваныя ў адпаведнасці з праектам Канцэпцыі фарміравання ўніверсальных кампетэнцый дзяцей і вучнёўскай моладзі. Прапануецца тэхналагічная матрыца фарміравання ўніверсальных кампетэнцый і функцыянальнай адукаванасці вучняў у адпаведнасці са зменамі ў структуры і змесце вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» да 2024/2025 навучальнага года.

**Ключавыя словы:** універсальныя кампетэнцыі; функцыянальная адукаванасць; пачатковая адукацыя; вучэбная праграма «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь».

Стратэгія арганізацыі адукацыйнага працэсу пры засваенні зместу вучэбнай праграмы «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» (вучэбнай праграмы) у IV класе прадугледжвае комплекснае фарміраванне ў вучняў універсальных кампетэнцый. У тэарэтычным плане яны ахарактарызаваны ў праекце Канцэпцыі фарміравання ўніверсальных кампетэнцый дзяцей і вучнёўскай моладзі [1]. Практыка-арыентаваны напрамак рэалізуецца праз вызначэнне комплексу спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, авалоданне якімі прадугледжвае засваенне вучнямі зместу абноўленай вучэбнай праграмы. Пры гэтым актуальным з’яўляецца прадстаўленне спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці не толькі як сродкаў рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу, але і як дыдактычнага інструментарыю для фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў. У дадзеным выпадку функцыянальная адукаванасць прадугледжвае развіццё асобы вучня як патрыёта і грамадзяніна ў працэсе яго тэрытарыяльна-культурнай і нацыянальна-грамадзянскай

*Артыкул падрыхтаваны на аснове матэрыялаў даследавання, праведзенага па заданні «Распрацаваць навукова-метадычнае забеспячэнне фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі» ГНТП «Функцыянальная адукаванасць» (2021—2025 гады).

ідэнтыфікацыі пры пазнанні культурна-гістарычнага асяроддзя Беларусі з улікам каштоўнасных арыенціраў сучаснага беларускага грамадства.

Фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў як праблема айчыннай педагогікі грунтоўна разглядаецца ў артыкуле доктара педагагічных навук Л. С. Васюковіч. Даследчык адзначае, што на сёняшні дзень існуе багаты вопыт тэарэтычнага вывучэння праблемы фарміравання функцыянальнай адукаванасці і яе навукова-метадычнага забеспячэння (Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, В. Ф. Русецкі, А. А. Гулецкая, В. І. Цірынава і інш.) [2, с. 18]. Праведзены Л. С. Васюковіч аналіз адукацыйнага стандарта пачатковай адукацыі сведчыць, што функцыянальная адукаванасць характарызуецца як назапашаны вопыт, супрацоўніцтва ў дынамічным соцыуме, уменне вырашаць нестандартныя задачы, дзейнічаць у нязвыклых умовах [2, с. 15]. Аўтар акцэнтуе ўвагу на патрабаванні вучэбных праграм адносна станаўлення асобы вучня як носьбіта каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры, патрыёта і грамадзяніна, развіццё яго творчых здольнацей у сацыяльна значнай дзейнасці [2, с. 14]. У гэтым аспекце варта ўлічыць распрацаваныя ў Акадэміі адукацыі пад кіраўніцтвам доктара педагагічных навук, прафесара В. Р. Стуканава факультатыўныя заняткі для вучняў II—IV класаў, у прыватнасці модуль «Калейдаскоп нацыянальнай культуры», арыентаваны на трансляцыю традыцый свайго народа, засваенне ведаў аб гісторыі, міфалогіі, мастацтве [3, с. 43].

Фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў з’яўляецца стратэгічным кірункам развіцця сучаснай сістэмы адукацыі і пачатковай адукацыі ў прыватнасці. Гэта звязана з падрыхтоўкай асобы малодшага школьніка, гатовай і здольнай выкарыстоўваць засвоеныя веды і сфарміраваныя ўменні ў разнастайных жыццёвых сітуацыях [4, с. 16]. Пры засваенні зместу вучэбнай праграмы «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» прыярытэтнымі відамі функцыянальнай адукаванасці вызначаны наступныя:

*сацыякультурная адукаванасць*. Здольнасць вучня эфектыўна выкарыстоўваць дасягненні чалавецтва ў галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры, у тым ліку культурна-гістарычную спадчыну беларускага народа пры суб’ектывізацыі ўласнага жыццёвага вопыту падчас сацыялізацыі ў грамадстве ў адпаведнасці з агульнапрынятымі нормамі і правіламі сацыяльных паводзін. Дадзены від функцыянальнай адукаванасці арыентаваны на выпрацоўку ўмення жыць у сучасным беларускім грамадстве і сугучны з пазіцыяй акадэміка Расійскай акадэміі адукацыі Б. С. Гяршунскага аб тым, што фарміраванне адукаванасці з’яўляецца задачай не толькі школы, але і ўсяго грамадства [5, с. 61—64].

Пры фарміраванні сацыякультурнай адукаванасці ў працэсе засваення зместу вучэбнай праграмы «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» прадугледжваецца, напрыклад, мадэліраванне вучнямі сваіх сацыяльных учынкаў з арыентацыяй на традыцыйную сістэму каштоўнасцей з улікам прадстаўлення ў змесце вучэбнага матэрыялу ўзораў паводзін чалавека ў гісторыі;

*чытацкая адукаванасць*. Здольнасць вучня знаходзіць і здабываць інфармацыю, інтэграваць і інтэрпрэтаваць яе, асэнсоўваць і ацэньваць змест і форму тэксту, выкарыстоўваць інфармацыю з яго. Пры фарміраванні чытацкай адукаванасці ў працэсе засваення зместу вучэбнай праграмы прадугледжваецца свядомае засваенне вучнямі зместу вучэбнага матэрыялу, пададзенага ў выглядзе апавяданняў у сюжэтнай форме; кантэкстнае выкарыстанне зместу паняццяў (з дапамогай слоўніка ў вучэбным дапаможніку); чытанне гістарычнай картасхемы (карты атласа) і гэтак далей. Адзначым, што, па меркаванні Л. С. Васюковіч, без чытацкай адукаванасці ў якасці базы

кагнітыўнай дзейнасці немагчыма засваенне ўсіх кампанентаў функцыянальнай адукаванасці [2, с. 15]. У гэтым плане паказальнымі можна лічыць рэкамендацыі па выніках праведзенага ў 2023 годзе вывучэння чытацкай адукаванасці (чытання і разумення тэксту) на беларускай мове вучняў IV класаў, у прыватнасці класіфікацыю чатырох груп чытацкіх уменняў з тыпалагізаванымі фармулёўкамі адпаведных спосабаў дзейнасці [6, с. 28—30];

*інфармацыйная адукаванасць*. Здольнасць вучня здабываць неабходную інфармацыю з розных крыніц, аналізаваць і ацэньваць яе дакладнасць і практычнасць, ужываць інфармацыю для дасягнення асабовых, сацыяльных, адукацыйных мэт згодна з грамадскімі маральнымі рэгулятывамі. Пры фарміраванні інфармацыйнай адукаванасці ў працэсе засваення зместу вучэбнай праграмы прадугледжваецца, напрыклад, работа па перакадзіраванню вербальна-лагічнай (тэкставай) інфармацыі ў вобразна-наглядную, у тым ліку з дапамогай мастацкіх сродкаў, і, наадварот, атрыманне інфармацыі падчас удзелу ў экскурсіях, падарожжах, сустрэчах са знакамітымі землякамі, наведванні музеяў і іншых устаноў.

Фарміраванне ахарактарызаваных вышэй відаў функцыянальнай адукаванасці патрабуе вызначэння комплексу вучэбных дзеянняў вучняў у адпаведнасці з патрабаваннямі да вынікаў іх адукацыйнай дзейнасці.

Адзначым, што ў абноўленай праграме «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» абазначаны чакаемыя вынікі развіцця, выхавання і навучання вучняў (*табліца 1*).

**Табліца 1 — Суаднесенасць задач і вынікаў засваення зместу вучэбнай праграмы «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь», IV клас**

| Задачы вывучэння | Вучэбныя дзеянні |
|---|---|
| ***Асобасныя*** *(кампетэнцыі грамадзянскасці, устойлівага асобаснага развіцця, эмацыянальнай рэгуляцыі, камунікацыі)* | |
| Фарміраванне ў вучняў любові да малой радзімы, павагі да Бацькаўшчыны, пачаткаў грамадзянскасці | • Ідэнтыфікуе сябе як ураджэнца Беларусі, жыхара краіны, беларуса па нацыянальнасці, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;<br>• праяўляе пачуццё любові да малой радзімы;<br>• паважае гістарычныя геральдычныя сімвалы свайго рэгіёну, дзяржаўную сімволіку Рэспублікі Беларусь |
| Развіццё эмацыянальна-каштоўнаснай сферы асобы праз прыняцце ў якасці норм сацыяльных паводзін традыцыйнай сістэмы каштоўнасцей беларускага народа, існуючых у сучасным сацыяльна-культурным асяроддзі | • Ганарыцца гісторыка-культурнымі дасягненнямі Беларусі;<br>• тлумачыць запаветы гістарычных асоб і дзеячаў культуры;<br>• выкарыстоўвае прыклады сацыяльных паводзін чалавека ў гісторыі ў якасці культурна-гістарычных аналагаў;<br>• падтрымлівае паважлівыя адносіны да прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей і канфесій |
| Развіццё пазнавальнай цікавасці асобы да гісторыі Беларусі | • Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі на гістарычную тэматыку |
| Ужыванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму | • Карыстаецца беларускай мовай як адной з дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь |

*Заканчэнне*

| Задачы вывучэння | Вучэбныя дзеянні |
|---|---|
| ***Метапрадметныя** (кампетэнцыі мыслення, каапераацыі)* | |
| Авалодванне вучнямі спосабамі пошуку і апрацоўкі інфармацыі з розных крыніц | • Вызначае галоўнае ў змесце вучэбнага матэрыялу;<br>• праводзіць элементарнае параўнанне і робіць на гэтай аснове вывады;<br>• лагічна і паслядоўна складае расказ;<br>• мэтанакіравана робіць запыт крыніц з неабходнай інфармацыяй;<br>• дае азначэнні паняццям з дапамогай гістарычнага слоўніка |
| Назапашванне вопыту прадуктыўнай камунікацыі і супрацоўніцтва | • Удзельнічае ў сумесным вырашэнні практычных задач |
| ***Прадметныя*** | |
| Фарміраванне сукупнасці першапачатковых зборных вобразаў свайго роднага краю, краіны, дзяржавы, дзейнасці гістарычных асоб і творчасці прадстаўнікоў культуры Беларусі | • Расказвае пра гістарычных асоб і звязаныя з імі гістарычныя падзеі;<br>• прыводзіць прыклады подзвігаў ураджэнцаў Беларусі;<br>• удзельнічае ў краязнаўчай дзейнасці;<br>• прымае ўдзел у захаванні мясцовых помнікаў гісторыі і культуры;<br>• супастаўляе артэфакты (гістарычныя рэчы), з якімі пазнаёміўся ў час экскурсій, падарожжаў, наведвання музеяў, сустрэч са знакамітымі землякамі, са сваім жыццёвым вопытам;<br>• удзельнічае ў святкаванні памятных дат і дзяржаўных свят Рэспублікі Беларусь |

Прадстаўленыя ў табліцы 1 вучэбныя дзеянні адпавядаюць *універсальным вучэбным дзеянням*, якія, згодна акадэміку Расійскай акадэміі адукацыі А. Р. Асмолаву, забяспечваюць самастойнае засваенне суб'ектна новых для вучняў ведаў і фарміраванне ўменняў, якія ўключаюць арганізацыю працэсу пазнання [7, с. 75]. Такімі ўніверсальнымі вучэбнымі дзеяннямі можна лічыць наступныя:

- *пазнавальныя*. Сфарміраванасць у вучняў агульналагічных прыёмаў (аналіз, параўнанне, абагульненне, падвядзенне пад паняцце, аналогія); элементарных даследчых навыкаў; вызначэнне дакладнасці інфармацыі;
- *рэгулятыўныя*. Планаванне і прагназаванне вучнямі сваіх дзеянняў, іх самакантроль і самарэфлексія; рэгуляцыя пачуццяў і эмоцый у адносінах да гістарычных персанажаў і дзеячаў культуры, да краіны і дзяржавы; праяўленне пазітыўнай эматыўнасці ў працэсе пазнання культурна-гістарычнай спадчыны малой радзімы;
- *камунікатыўныя*. Пабудова вучнямі маўленчых выказванняў; мадэліраванне сваіх зносін з гістарычнымі персанажамі, розных сацыяльных роляў у гістарычна абумоўленай сітуацыйнай дзейнасці; удзел у адукацыйнай, праектнай, краязнаўчай дзейнасці.

Абазначаныя ў табліцы 1 асобасныя і метапрадметныя кампетэнцыі адпавядаюць праекту Канцэпцыі фарміравання ўніверсальных кампетэнцый дзяцей і вучнёўскай

моладзі [1] і канкрэтызуюцца наступным чынам.

*Кампетэнцыя грамадзянскасці*. Фарміраванне паважлівых адносін да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь, пачуцця гонару за гістарычныя і сучасныя дасягненні малой радзімы і краіны. Дадзеная кампетэнцыя, напрыклад, патрабуе ад вучняў умення тлумачыць паходжанне назваў краіны, сталіцы Беларусі, абласных цэнтраў, свайго населенага пункта, змест такіх паняццяў, як Радзіма і Бацькаўшчына; выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні для ідэнтыфікацыі сябе ў навакольным сацыяльна-культурным асяроддзі.

*Кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця*. Фарміраванне ўмення вучыцца; выпрацоўка беражлівых адносін да помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі; набыццё вучнямі вопыту сацыяльных паводзін у адукацыйных і рэальных жыццёвых умовах у адпаведнасці з сістэмай значных для сучаснага беларускага грамадства каштоўнасцей, а таксама ў мадэліраваных сітуацыях з выкарыстаннем культурна-гістарычных аналагаў (узораў учынкаў чалавека ў гісторыі). Названая кампетэнцыя патрабуе ад вучняў, напрыклад, умення тлумачыць запаветы Кірылы Тураўскага, Еўфрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Францішка Багушэвіча; выкарыстання засвоеных ведаў і сфарміраваных уменняў для падтрымання паважлівых адносін да асоб розных нацыянальнасцей і веравызнанняў.

*Кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі*. Атрыманне вучнямі пазітыўных эмоцый пры пазнанні культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі; усведамленне імі сваіх пачуццяў і пачуццяў гістарычных асоб з праявай суперажывання ў адносінах да іх. Дадзеная кампетэнцыя патрабуе ад вучняў, напрыклад, умення складаць паведамленні пра славутых землякоў; выкарыстання засвоеных ведаў і сфарміраваных уменняў для адчування гістарычнай пераемнасці з продкамі ці сваімі папярэднікамі і іх здзяйсненнямі на эмацыянальна-пачуццёвым узроўні.

*Кампетэнцыя камунікацыі*. Набыццё вучнямі вопыту камунікацыі як з аддаленымі па часе іх жыцця гістарычнымі персонамі, так і сучаснымі славутымі землякамі. Гэтая кампетэнцыя патрабуе, напрыклад, умення пабудовы вучнямі выказванняў у пісьмовай і вуснай формах, выкарыстання засвоеных ведаў і сфарміраваных уменняў для складання кароткага апісання мастацкай ілюстрацыі на гістарычную тэматыку з улікам перавагі візуальнага канала ўспрымання інфармацыі, які дамінуе ў сучасных вучняў.

*Кампетэнцыя мыслення*. Авалоданне прыёмамі лагічнага (аналіз, параўнанне, тлумачэнне прычынна-следчых сувязей паміж аб'ектамі вывучэння, фармулёўка элементарных высноў з іх аргументаваным доказам) і крытычнага мыслення (вызначэнне дакладнасці і карыснасці інфармацыі, ажыццяўленне самарэфлексіі дзейнасці). Разглядаемая кампетэнцыя патрабуе, напрыклад, знаходжання ў тэксце прыкладаў для падцвярджэння прапанаванага палажэння ці доказу, перакадзіравання нагляднавобразных (візуалізаваных) і вербальналагічных (тэкставых) крыніц інфармацыі, выкарыстання засвоеных ведаў і сфарміраваных уменняў для правядзення даследавання.

*Кампетэнцыя каапераціі*. Назапашванне вучнямі вопыту супрацоўніцтва пры сумеснай дзейнасці; іх узаемадзеянне ў працэсе вырашэння вучэбных і практычных задач, што патрабуе, напрыклад, умення планаваць і размяркоўваць абавязкі, выконваць розныя сацыяльныя ролі, выкарыстоўваць засвоеныя веды і сфарміраваныя ўменні для стварэння калектыўнага адукацыйнага прадукта ў межах праектнай і краязнаўчай дзейнасці ці ўдзелу ў захаванні мясцовых помнікаў гісторыі і культуры.

Тэхналагічная матрыца фарміравання ўніверсальных кампетэнцый і функцыянальнай адукаванасці, распрацаваная ў адпаведнасці са зменамі ў структуры і змесце вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» да 2024/2025 навучальнага года, прадстаўлена ў табліцы 2. Выбар вучэбных дзеянняў настаўнік ажыццяўляе з улікам мэт і задач вывучэння пэўнай тэмы, рэгіёна пражывання, а таксама ўзроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў.

**Табліца 2 — Тэхналагічная матрыца фарміравання ўніверсальных кампетэнцый і функцыянальнай адукаванасці вучняў пры засваенні зместу вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь»**

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| **Урок 1. Беларусь — мая Радзіма** | | | |
| Паняцце «Бацькаўшчына» | | Пошук тлумачэння незнаёмых слоў | Тлумачыць змест тэрмінаў (Радзіма, Бацькаўшчына, продкі, гісторыя) з дапамогай гістарычнага слоўніка *(кампетэнцыі грамадзянскасці і ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Паходжанне назваў «Беларусь» і «беларусы» | Складанне сямейнага радаводу (сямейнага дрэва) | Вызначэнне дакладнасці паданняў | Тлумачыць версіі паходжання назвы краіны і яе жыхароў *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| | | Перакадзіраванне тэкставай інфармацыі аб сваіх продках у нагляднавобразную | Ідэнтыфікуе сябе ў сацыяльна-культурным асяроддзі як ураджэнца Беларусі і як беларуса па нацыянальнасці *(кампетэнцыі грамадзянскасці і ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыяльна-культурная адукаванасць)* |
| Шматнацыянальны склад насельніцтва Беларусі | | Выкананне правіл узаемадзеяння з вучнямі іншых нацыянальнасцей | Адносіцца з павагай да асоб іншай нацыянальнасці *(кампетэнцыя камунікацыі, сацыяльна-культурная адукаванасць)* |
| **Раздзел 1. Геаграфічныя і гістарычныя звесткі пра нашу Радзіму (7 г.)** | | | |
| **Урок 2. Мы і нашы суседзі** | | | |
| Размяшчэнне Беларусі на карце Еўропы. Краіны — суседкі Беларусі. Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Рэспублікі Беларусь. Насельніцтва Беларусі | Запаўненне контурнай карты | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай карт атласа | Паказвае на карце Еўропы месцазнаходжанне Беларусі; краін — суседак Беларусі; тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, сталіцу і абласныя цэнтры, месца свайго пражывання *(кампетэнцыя грамадзянскасці, чытацкая адукаванасць)* |

*Працяг*

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| **Урок 3. Наша Радзіма на гістарычнай карце** | | | |
| Гістарычная карта як крыніца звестак пра мінулае. Абазначэнні на гістарычнай карце | Чытанне гістарычнай карты | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай картасхем (карт атласа) | Паказвае на гістарычнай картасхеме абазначаныя на ёй гарады і рэкі Беларусі з выкарыстаннем умоўных абазначэнняў *(кампетэнцыя мыслення, чытацкая адукаванасць)* |
| Правілы чытання гістарычнай карты | Складанне маршруту падарожжа на картасхеме | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з тэкставай у наглядна-вобразную і наадварот | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі на гістарычную тэматыку з выявай старажытнай карты Беларусі *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |
| **Урок 4. Стужка часу** | | | |
| Гістарычныя падзеі і іх даты. Стужка часу | | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай стужкі часу | Выкарыстоўвае адзінкі вымярэння гістарычнага часу (стагоддзе, дата) *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Паслядоўнае адлюстраванне гістарычных падзей на стужцы часу. Першая дакладна вядомая дата ў гісторыі нашай краіны | | Запаўненне стужкі часу з выкарыстаннем вызначальных для гісторыі Беларусі гістарычных дат | Вызначае паслядоўнасць гістарычных падзей (нараджэнне Ісуса Хрыста, першае згадванне пра Полацк, друкаванне кнігі Францыскам Скарынам) па іх датах на стужцы часу *(кампетэнцыя грамадзянскасці, інфармацыйная адукаванасць)* |
| | Складанне стужкі часу на аснове падзей уласнага жыцця | | Вызначае паслядоўнасць падзей уласнага жыцця *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |
| **Урок 5. Нашы продкі** | | | |
| Рассяленне ўсходнеславянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі | Запаўненне контурнай карты | Пошук тлумачэння незнаёмых слоў | Тлумачыць змест тэрміна «племя» з дапамогай гістарычнага слоўніка *(кампетэнцыя мыслення, чытацкая адукаванасць)* |
| | | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай картасхем (карт атласа) | Паказвае на картасхеме (картах атласа) рэгіёны рассялення ўсходнеславянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |

***Працяг***

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| Паходжанне назваў усходнеславянскіх плямён згодна з паданнямі | | Вызначэнне дакладнасці паданняў | Тлумачыць версіі паходжання назвы краіны і яе жыхароў *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Крывічы, дрыгавічы, радзімічы — продкі сучасных беларусаў | Складанне маршруту падарожжа на картасхеме з улікам месца жыхарства | Выбарачны вусны пераказ зместу апавядання | Вызначае на аснове выкарыстання картасхемы (карты атласа) сваю гістарычную пераемнасць з адным з усходнеславянскіх плямёнаў *(кампетэнцыі грамадзянскасці і ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |
| **Урок 6. Зямля блакітных рэк і азёр** | | | |
| Рэкі і азёры як сведкі гістарычнага мінулага нашай краіны | Запаўненне контурнай карты | Лакалізацыя гістарычных падзей з дапамогай картасхем (карт атласа) | Паказвае на картасхеме (картах атласа) рэкі (Дняпро, Прыпяць, Сож, Нёман, Заходняя Дзвіна) на тэрыторыі Беларусі *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Рака Няміга ў старажытным Менску | Удзел у экскурсіі па Мінску | Выбарачны вусны пераказ зместу апавядання | Вызначае сваю пераемнасць з гісторыяй адной з самых старажытных вуліц горада Мінска *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Рэкі — сродкі зносін і гандлю на шляху «з варагаў у грэкі» | Складанне маршруту падарожжа | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з тэкставай у наглядна-вобразную | Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі на гістарычную тэматыку, якая адлюстроўвае шлях «з варагаў у грэкі» *(кампетэнцыя грамадзянскасці, сацыяльна-культурная адукаванасць)* |
| Паданне пра возера Свіцязь | | Вызначэнне дакладнасці падання | Вызначае верагоднасць звестак аб падзеях, звязаных з возерам Свіцязь *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| **Урок 7. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны** | | | |
| Шляхі з'яўлення камянёў. Роля камянёў у жыцці і вераваннях старажытных жыхароў Беларусі | | Пошук тлумачэння незнаёмых слоў | Тлумачыць змест тэрмінаў (курган, волат) з дапамогай гістарычнага слоўніка *(кампетэнцыі грамадзянскасці і ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |

*Заканчэнне*

| Змест вучэбнай праграмы | Практыка-арыентаваныя работы | Асноўныя вучэбныя дзеянні | Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў |
|---|---|---|---|
| Курганы як помнікі гісторыі | | Вызначэнне дакладнасці паданняў | Вызначае верагоднасць звестак аб курганах і волатах *(кампетэнцыя мыслення, інфармацыйная адукаванасць)* |
| Ушанаванне памяці продкаў на Радаўніцу і Дзяды | Удзел у падарожжы, наведванні музеяў | Даследаванне артэфактаў (гістарычных прадметаў) | Удзельнічае ў захаванні мясцовых помнікаў прыроды і гісторыі, ва ўшанаванні памяці продкаў на Радаўніцу і Дзяды *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, інфармацыйная адукаванасць)* |
| **Урок 8. Як да нас прыйшла кніга** | | | |
| Пісьмовыя гістарычныя крыніцы пра нашу Бацькаўшчыну | | Пошук тлумачэння незнаёмых слоў | Тлумачыць змест тэрмінаў (летапіс, манах, вежа) з дапамогай гістарычнага слоўніка *(кампетэнцыі граматызянскасці і ўстойлівага асобаснага развіцця, чытацкая адукаванасць)* |
| Летапісы. Рукапісныя кнігі. Берасцяныя граматы | Мадэліраванне пісьма на ўмоўнай берасцяной грамаце | Даследаванне артэфактаў (гістарычных прадметаў) | Тлумачыць назву «берасцяная грамата» і яе прызначэнне *(кампетэнцыя мыслення, чытацкая адукаванасць)* |
| Маральны запавет Кірылы Тураўскага | | Перакадзіраванне вучэбнай інфармацыі з наглядна-вобразнай у вербальную (тэкставую, славесную) | Тлумачыць маральны запавет Кірылы Тураўскага людзям любіць адзін аднаго *(кампетэнцыя ўстойлівага асобаснага развіцця, сацыяльна-культурная адукаванасць).*<br>Складае кароткае апісанне мастацкай ілюстрацыі на гістарычную тэматыку (партрэт Кірылы Тураўскага) *(кампетэнцыя эмацыянальнай рэгуляцыі, сацыяльна-культурная адукаванасць)* |

**Літаратура**


1. Концепция формирования универсальных компетенций детей и учащейся молодёжи (проект) [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://adu.by/images/2023/05/kontseptsiya-proekt.pdf. — Дата доступа: 22.04.2024.
2. *Васюковіч, Л. С.* Праблема фарміравання функцыянальнай пісьменнасці ў айчыннай педагогіцы / Л. С. Васюковіч // Веснік адукацыі. — 2024. — № 1. — С. 10—20.
3. Формирование функциональной грамотности у учащихся начальной школы в процессе воспитательной работы // Веснік адукацыі. — 2023. — № 9. — С. 41—47.

4. *Русецкий, В. Ф.* Формирование функциональной грамотности как научная и образовательная проблема / В. Ф. Русецкий, О. В. Зеленко // Веснік адукацыі. — № 9. — 2020. — С. 15—22.
5. *Гершунский, Б. С.* Философия образования : учеб. пособие для студентов высш. и сред. педагог. учеб. заведений / Б. С. Гершунский. — М. : Московский психолого-социальный институт, 1998. — 432 с.
6. Рэкамендацыі па выніках вывучэння чытання і разумення тэксту (чытацкай адукаванасці) на беларускай мове вучняў IV класаў // Веснік адукацыі. — 2024. — № 4. — С. 15—31.
7. Как проектировать универсальные учебные действия в начальной школе: от действия к мысли : пособие для учителя / А. Г. Асмолов [и др.] ; под ред. А. Г. Асмолова. — М. : Просвещение, 2008. — 151 с.

**(Заканчэнне — у адным з наступных нумароў часопіса.)**

*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 02.08.2024.*

FORMATION OF FUNCTIONAL LITERACY OF STUDENTS IN THE PROCESS OF MASTERING THE CONTENT OF THE CURRICULUM «MAN AND THE WORLD. MY HOMELAND IS BELARUS»

Sergey V. Panov,
Leading Researcher at the Laboratory of Primary Education
Academy of Education, Ph.D. in Pedagogy, Associate Professor;
*swpanow@gmail.com*

The article highlights the theoretical aspects of functional literacy of primary school students, developed in accordance with the draft Concept of the formation of universal competencies of children and students. A technological matrix for the formation of universal competencies and functional literacy of students is proposed in accordance with changes in the structure and content of the curriculum for the academic subject «Man and the World. My Homeland is Belarus» by the 2024/2025 academic year.

Keywords: universal competencies; functional literacy; primary education; curriculum «Man and the World. My Homeland Is Belarus.»

**(To be continued.)**

*Submitted 02.08.2024.*